# Гісторыя

*А.Р. ДЗЯНІСАВА*

## ПРАВАСЛАЎНЫЯ МАНАСТЫРЫ ТУРАВА-ПІНСКАГА РЭГІЁНА

У XI–XIII ст. Тураў быў сталіцай удзельнага княства, найбольш уплывовымі гарадамі якога з'яўляліся Пінск і Слуцк. У непасрэднай блізкасці да Турава знаходзіўся Мазыр, які меў з ім агульныя палітычныя, эканамічныя і рэлігійныя стасункі. Усе згаданыя гарады ўваходзілі ў Прыпрыпяцкі рэгіён, што спрыяла ўмацаванню іх адносін.

З распаўсюджаннем у X–XI ст. на беларускіх землях хрысціянства Тураў становіцца аплотам праваслаўнага веравызнання. Згодна з жаданнем вялікага князя Уладзіміра пры Святаполку I у гэтым горадзе заснуоўваецца епіскапская кафедра. Узнікае, такім чынам, епархія, у склад якой увайшлі гарады Пінск і Слуцк[1]. З тых часоў у Турава-Пінскім рэгіёне існуюць праваслаўныя абіцелі. Гісторыя данесла да нас звесткі аб наступных манастырах: Пінскіх – Лешчанскім Успенскім і Богаяўленскім (мужчынскіх), Варварынскім (жаночым); Дзятлавіцкім Праабражэнскім, Дубайскім, Купяціцкім Увядзенскім, Навадворскім Успенскім (мужчынскіх); Слуцкіх – Троіцкім, Праабражэнскім (мужчынскіх), Ільінскім, спачатку мужчынскім, а потым жаночым; Грозаўскіх – Мікалаеўскім і Іаана-Багаслоўскім, Старчыцкім Петра-Паўлаўскім і Цэпранскім Крыжаузвіжанскім (мужчынскіх); Мазырскіх – Яснагорскім Петра-Паўлаўскім (мужчынскім) і Параскевінскім (жаночым); Тураўскіх – Барыса-Глебскім (мужчынскім) і Варварынскім (жаночым); Морацкім Мікалаеўскім (мужчынскім).

Звесткі пра дакладны час узнікнення многіх з пералічаных манастыроў, асабліва найбольш старажытных, можна знайсці ў легендах, паданнях, летапісах. Верагодна, што першымі заснавальнікамі праваслаўных манастыроў на Беларусі былі вялікія ці мясцовыя князі, а таксама асобы, да іх набліжаныя, што прынялі хрысціянства. Так, напрыклад, адна з версій звязвае ўзнікненне Пінскага Лешчанскага манастыра з Уладзімірам, вялікім князем Кіеўскім; заснаванне Тураўскага Варварынскага манастыра – з імем Варвары, жонкі Святаполка Ізяславіча, якая жыла ў гэтым манастыры з дзяцьмі пасля смерці князя. Сказанне аб Марціне-мніху, якое датуецца XII ст., паведамляе аб існаванні ў Тураве Барыса-Глебскай абіцелі [2].

Праваслаўныя манастыры з цягам часу становяцца неад'емнай часткай жыцця краю, яго жыхароў. Павагу і пашану людзей яны заслугоўвалі дзякуючы сваёй дзейнасці па распаўсюджанню веры, адукацыі ў народзе, а таксама святыням, якія ў іх меліся. Самымі вядомымі былі іконы Маці Божай Купяціцкая, Навадворская, Старчыцкая, цудатворная Лешчанская драўляная выява Збавіцеля. Асабліва ўшаноўвалася ў Турава-Пінскім рэгіёне Уладзімірская ікона Багародзіцы як родавая святыня нашчадкаў Юрыя



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Далгарукага, якую падаравау князю Канстанцінопальскі патрыярх Лука Хрысаверг. ікону напісау Евангеліст Лука. Яна лічылася цудадзейнаю[3].

Існавалі манастыры за кошт працы манахау і шматлікіх ахвяраванняу, якія рабілі і простыя людзі, і прадстаунікі вельмі заможных княжацкіх сем'яу. Праваслауныя манастыры у Турава-Пінскім рэгіёне карысталіся падтрымкай і апекай Алелькавічау і Яраславічау, Радзівілау, Далматау, Войнау. Запісы і падараванні на карысць манастырскай казне былі самыя разнастайныя: грошы, маёнткі, пляцы і многае іншае[4].

Так, напрыклад, у 1401 г. воін Фёдар Калодка дау мазырскім манахам грошы з тым, каб была пабудавана Петра-Паулауская царква пад гарой. Каля 1520 г. пінскі князь Фёдар іванавіч Яраславіч разам са сваёй жонкай Аленай Алелькаунай запісау Пінскаму Варварынскаму манастыру дворышча Піскалоушчына у сяле Асабовічы. У 1521 г. тым жа пінскім князем Фёдарам Іванавічам былі пабудаваны пры Варварынскай царкве новыя драуляныя манастырскія будынкі. У 1689 г. княгіня Караліна Радзівіл запісала Слуцкаму Праабражэнскаму манастыру вострау Кочау у Даманавічах. Гэтыя і шматлікія іншыя прыклады маёмасных падараванняу сведчаць аб павазе і падтрымцы праваслауных абіцеляу з боку насельніцтва.

Накірункі дзейнасці манастыроу праваслаунага веравызнання Турава-Пінскага рэгіёна былі рознабаковымі, галоуным сярод якіх стала распаусюджанне у народзе веры і адукацыі. У гэтым сэнсе паказальна асветніцкая дзейнасць Кірылы Тураускага, які жыу і працавау у Тураускім Барыса-Глебскім манастыры. У Пінскім Лешчанскім у XIV ст. стварау летапіс краю інак Мітрафан, праца якога да нашага часу не захавалася. Пры некаторых абіцелях меліся навучальныя установы. Так, напрыклад, дзейнічалі школы пры Пінскіх Лешчанскім і Богаяуленскім манастырах. Пры Богаяуленскім існавала вучылішча, у якім выкпадаліся беларуская, польская, лацінская і грэчаская мовы, а таксама сем так званых "свабодных мастацтвау". Духоуная школа існавала пры Слуцкім Праабражэнскім манастыры. У XVI ст. дзейнічала школа і у Слуцкім Троіцкім мужчынскім манастыры, заснаваная ігуменам Арцеміем; у ёй вывучаліся граматыка (славянская і грэчаская), рыторыка, дыялектыка. Пры манастыры была заснавана і Духоуная кансісторыя, якая дзейнічала да 1789 г., а з 1792 г. тут знаходзілася семінарыя, пераведзеная у 1840 г. у Мінск [5].

Розны лёс напаткау праваслауныя манастыры рэгіёна. Тураускія Барыса-Глебскі і Варварынскі былі разрабаваны і знішчаны татарамі, верагодней за усё, у XIII ст. Пацярпелі ад войнау і пажарау Пінскі Богаяуленскі, Слуцкія Праабражэнскі і Троіцкі, Грозаускі Іаана-Багаслоускі і іншыя манастыры.

Пераломным у жыцці праваслауных абіцеляу рэгіёна стала XVI ст., калі Беларусь, якая уваходзіла у склад Вялікага княства Літоускага, падверглася рэфармацыйным уплывам. У прыватнасці, менавіта тады, напрыканцы стагоддзя, была заключана Брэсцкая царкоуная унія. Многія з вышэйазначаных манастыроу былі далучаны да уніі, іншыя сталі аб'ектамі бясконцых судовых спрау, прадметамі куплі-продажу. Нярэдка манастыры рабіліся ахвярамі узброеных нападау з боку уніятау і іх прыхільнікау, калі рабавалася іх маёмасць, а манахау праганялі прэч.

Пінскі Варварынскі жаночы манастыр з увядзеннем уніі стау уніяцкім. Праваслауных манахінь прагналі і згодна з каралеускім указам Уладзіслава IV 1635 г. ім забаранілі жыць у Пінску[6]. У 1743 г. уніяцкі настаяцель Цэпранскага манастыра Аляксей Кандратовіч спачатку не дазваляу сялянам маёнтка Новы Двор падпарадкоувацца мясцоваму праваслаунаму Успенскаму манастыру, потым паслау да яго сваіх людзей, якія абражалі праваслаунага ігумена, а потым і сам разам з узброенымі прыхільнікамі зрабіу напад на манастыр. Маёмасць манастыра разрабавалі, а манахау пабілі і прагналі.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Але, нягледзячы на цяжкі час і складаныя ўмовы, у XVII ст. і пазней на тэрыторыі Турава-Пінскага рэгіёна узнікаюць праваслаўныя абіцелі, якія разам з існуючымі ўтвараюць аплот праваслаўя. Многія з іх засноўваюцца ўзнікшымі ў гэты час праваслаўнымі брацтвамі, а таксама заможнымі людзьмі.

Так, напрыклад, у 1622 г. каралеўскі дваранін Канстанцін Далмат запісаў на Дзятлавіцкую Праабражэнскую царкву свае маёнткі Дзятлавічы і Лунінец з тым, каб кіева-пячэрскія настаяцелі заснавалі тут манастыр і каб ён заусёды падпарадкоўваўся Канстанцінопальскаму патрыярху і Кіеўскаму мітрапаліту. У 1629 г. Апалонія Валовіч Война, кашталянша Брэсцкая, маючы павагу да цудатворнай Купяціцкай іконы, пераканала свайго сына Васіля Копця купіць вёску Купяцічы і пабудаваць тут манастыр, першапачаткова ў якім пасялілася брація з Віленскага Свята-Духава манастыра. У 1600 г. пры старажытнай Праабражэнскай царкве Слуцка праваслаўным царкоўным брацтвам быў заснаваны манастыр, якому ў знак увагі і прыхільнасці у 1620 г. Іерусалімскі патрыярх Феафан дараваў крыж і грамату, якая вызваляла манастыр ад падпарадкавання мясцовай іерархіі і ставіла у залежнасць толькі ад Канстанцінопальскага патрыярха. У жніўні 1614 г. у Пінску упершыню з'яўляецца Богаяўленскі манастыр пасля таго, як на сродкі шляхцянкі Яніны Галабурдзінай і Пінскага праваслаўнага брацтва была закладзена царква у імя Богаяўлення, будаўніцтва якой было скончана 25 жніўня. Пры царкве пасяліліся манахі з Лешчанскага манастыра, аддадзенага уніятам.

Дзейнасць брацтваў, якія сваёй мэтай ставілі захаванне і абарону праваслаўнай веры і нацыянальнай культуры, заснаванне новых і падтрымку старых праваслаўных абіцеляў, выклікала незадавальненне як з боку уніятаў і католікаў, так і з боку улад Рэчы Паспалітай, у склад якой уваходзіла ў тыя часы Турава-Пінская зямля. Адметным тут з'яўляецца лёс ужо згаданага Пінскага Богаяўленскага манастыра, які адлюстроўваў становішча манастыроў і наогул праваслаўя ў дадзеным рэгіёне з часоў уніі.

Богаяўленскі манастыр у Пінску ўзнік у пачатку XVII ст. на сродкі праваслаўнага брацтва і шляхцянкі Я. Галабурдзінай. Яго будаўніцтва выклікала вялікае незадавальненне уніяцкага епіскапа Паісія Сахоўскага. У верасні 1614 г., сабраўшы прыхільнікаў уніі, а таксама сваіх прыгонных, П. Сахоўскі ўчыняе напад на манастыр. Царкву разабралі па бярвенцу, іконы парубілі, манахаў пабілі, а каштоўнасці П. Сахоўскі забраў сабе. Акрамя таго, упэўнены ў сваёй беспакаранасці, ён падаў судовы іск супраць Я. Галабурдзінай. Справа цягнулася амаль чатыры гады. Замкавы суд і Галоўны Літоўскі Трыбунал падтрымалі Я. Галабурдзіну, але ж Варшаўскі сойм і кароль Жыгімонт III вырашылі справу на карысць епіскапа [7].

І усё ж манастыр працягваў сваё існаванне. Першапачаткова манахі сяліліся па дамах у членаў Пінскага Богаяўленскага брацтва, якое мела свой статут і казну, кіравалася агульным сходам. У склад брацтва ўваходзілі ўсе прадстаўнікі гарадскога самакіравання, значная частка пінскіх купцоў і багатых рамеснікаў. Ахвяраванні ад мяшчан і шляхты ў выглядзе зямельных надзелаў, дамоў, грашовых сум, падтрымка з боку гарадскога самакіравання – усё гэта надало яму значную грамадскую вагу. У 1633 г. члены брацтва дабіваюцца ад караля Уладзіслава IV дазволу на будаўніцтва манастыра, вучылішча, школы і шпіталя. Манастыр быў адбудаваны. У XVII–XVIII ст. яго ігумен пад вышэйшым кіраўніцтвам Кіеўскага мітрапаліта загадваў цэрквамі і праваслаўнымі абіцелямі Пінскай епархіі і карыстаўся тытуламі Тураўскага і Давыд-Гарадоцкага афіцыяла. Пры манастыры працавалі пачатковая школа, вучылішча і шпіталь.

1648 г. прынёс Богаяўленскаму манастыру новае выпрабаванне. У гэтым годзе ў Пінску пры ўдзеле казакаў успыхнуў бунт. Але хутка горад штурмам



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

узялі польскія войскі, якія і падпалілі яго. У гэтыя дні згарэў і Богаяўленскі манастыр. Аднак ужо ў 1650 г. ён адбудоўваецца, абносіцца новай агароджай. У ім, акрамя Богаяўленскай, з'яўляецца зімовая царква святога Мікалая Цудатворца. Аднаўлены манастыр выклікаў незадавальненне уніятаў і католікаў, таму ён неаднаразова падвяргаўся нападам з іх боку, але змог адстаяць сваё права на існаванне.

Богаяўленскі манастыр не вылучаўся асабліва вялікім даходам. Так, у 1766 г. ён меў 17 дзесяцін зямлі, 13 дамоў у Пінску, 1740 злотых прыбытку у год. І тым не менш ён быў дастаткова вядомым як у сваім рэгіёне, так і за яго межамі. Аб гэтым сведчыць і тая падзея, што адбылася тут у канцы XVIII ст. На Чатырохгадовым сейме (1788–1792 гг.) было прынята рашэнне аб скліканні генеральнай кангрэгацыі – сходу праваслаўнага духавенства і вернікаў Рэчы Паспалітай з мэтай стварыць у краіне аўтакефальную царкву, незалежную ад Сінода Расійскай імперыі. 31 сакавіка 1791 г. выйшлі універсалы, якія запрашалі праваслаўных на кангрэгацыю ў Пінск. Пасяджэнні былі адкрыты 15 чэрвеня ў Богаяўленскім манастыры пад старшынствам каралеўскага камісара Міхаіла Корвін-Гансеўскага. На пасяджэннях кангрэгацыі былі прыняты наступныя асноўныя рашэнні: паставіць на чале праваслаўнай царквы Рэчы Паспалітай мітрапаліта з кафедрай у Бельску; устанавіць тры епархіі; мітрапаліт і епіскапы павінны былі абірацца веруючымі і падпарадкоўвацца Канстанцінопальскаму патрыярху. Гэтыя рашэнні кароль зацвердзіў 21 траўня 1792 г. Але яны так і не ажыццявіліся. У 1793 г. адбыўся другі падзел Рэчы Паспалітай. Богаяўленскі манастыр папаў пад начала Святога Сінода Расіі і атрымаў сродкі на рэстаўрацыю. Аднак 22 траўня 1799 г. страшэнны пажар спаліў яго і тры чвэрці горада.

Праз год 29 траўня 1800 г. Петра-Паўлаўскі манастыр пераязджае з Мінска ў Пінск, пераймяноўваецца ў Богаяўленскі і размяшчаецца ў будынках езуітаў. Гэты манастыр быў спачатку першакласным, потым другакласным, існаваў да 1848 г., калі ў яго перавялі духоўнае вучылішча. На месцы ж старой абіцелі доўгі час знаходзіліся магілкі і капліца.

Лёс Пінскага Богаяўленскага манастыра, як і усіх манастыроў Турава-Пінскага рэгіёна, быў непарыўна звязаны з гісторыяй краю, падзеямі палітычнага і эканамічнага характару. Нягледзячы на неспрыяльныя абставіны, праваслаўная вера знаходзіла прытулак у абіцелях рэгіёна і працягвала жыць у сэрцах людзей.

У канцы XVIII ст. пасля падзелаў Рэчы Паспалітай Беларусь адышла да Расійскай імперыі. Праваслаўныя манастыры Турава-Пінскага рэгіёна сталі падпарадкоўвацца Святому Сіноду. У гэты час, з аднаго боку, праваслаўе атрымлівае апору і падтрымку. Але ж у канцы XVIII ст. і на працягу XIX ст. амаль усе праваслаўныя манастыры акрэсленага рэгіёна былі закрыты. Адбывалася гэта ў наступным парадку:

1797 г. – Слуцкі Праабражэнскі манастыр;
1810 г. – Грозаўскі Мікалаеўскі;
1817 г. – Купяціцкі Увядзенскі, Навадворскі Успенскі, Старчыцкі Петра-Паўлаўскі і Морацкі Мікалаеўскі;
1828 г. – Цэпранскі Крыжаўзвіжанскі;
1839 г. – Пінскі Лешчанскі;
1848 г. – Пінскі Богаяўленскі;
1855 г. – Слуцкі Ільінскі і Дзятлавіцкі Праабражэнскі;
1860 г. – Грозаўскі Іаана-Багаслоўскі;
1874 г. – Пінскі Варварынскі.

І толькі Слуцкі Троіцкі манастыр быў закрыты невядома калі. Усе будынкі яго разам з галоўным храмам разбураны на працягу першай паловы XX ст.

Так слынілі сваю дзейнасць манастыры, якія на працягу амаль сямі стагоддзяў увасаблялі сабой аплот праваслаўя ў Турава-Пінскім рэгіёне. Пры-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

чыны гэтаму былі розныя. Па-першае, дрэннае эканамічнае забеспячэнне і становішча як манастыроу, так і краю у цэлым. Па-другое, палітыка царскіх улад, скіраваная на скасаванне нацыянальных асаблівасцей і абмежаванне развіцця беларускай культуры.

Не было спрыяльных умоу для узнікнення і дзейнасці праваслауных абіцеляу і у XX ст. Толькі за апошнія дзесяць гадоу змяніліся адносіны грамадства і улады да царквы і рэлігіі у цэлым. Так, на Беларусі, у прыватнасці у Турава-Пінскім рэгіёне, пачалі аднауляць сваю дзейнасць праваслауныя манастыры: у 1992 г. – у Хойніках, у 1993 г. – у Пінску і у вёсцы Юравічы Калінкавіцкага раёна[8]. І трэба спадзявацца, што яны будуць не апошнімі у Турава-Пінскім рэгіёне.

[1] Гл.: Мартос А. Беларусь в исторической государственной и церковной жизни. Мн., 1990. С. 69.
[2] Гл.: Сведкі беларускай мінуушчыны (зборнік дакументау і матэрыялау па гісторыі Беларусі VI–XV стст.). Мн., 1996. С. 54.
[3] Гл.: Яскевіч А. Падзвіжнікі і іх святыні. Мн., 2001. С. 130.
[4] Гл.: Историко-статистическое описание Минской епархии, составленное ректором Минской духовной семинарии архимандритом Николаем. СПб., 1864; Ревизия пущ и переходов звериных в бывшем Великом княжестве Литовском, с присовокуплением грамот и привилегий на входы в пущи и на земли. Вильно, 1867; Собрание древних грамот и актов городов Минской губернии, православных монастырей, церквей и по разным предметам. Мн., 1848.
[5] Гл.: Кулагін А.М. Праваслауныя храмы на Беларусі. Мн., 2001. С. 294.
[6] Гл.: Чистович И. Очерк истории западно-русской церкви: В 2 ч. СПб., 1884. Ч. 2. С. 197.
[7] Гл.: Товаров А.В. Историко-статистическая справочная книга Минской епархии. Мн., 1903. С. 113.
[8] Гл.: Монастыри. Энциклопедический справочник. М., 2000. С. 267, 271–272.

***Алена Рыгораўна Дзянісава*** – аспірантка кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоу. Навуковы кіраунік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт Ю.Л. Казакоу.

*Н.А. РОЦЬКА*

## ЗМЕНЫ У СТАНОВІШЧЫ ЧЫНОУНІЦТВА БЕЛАРУСІ (60–90-я гг. XIX ст.)

У беларускіх выданнях XIX ст. слова «чыноунік» азначала наступнае: «...той, хто меу які-небудзь чын на дзяржаунай службе». Аднак у асобных творах другой паловы XIX ст., асабліва публіцыстычных, слова набывала больш выразны сэнс: «...чыноунік – гэта дзяржауны служачы, які абараняу інтарэсы цара і самауладдзя»[1] (тут і далей – пераклад *Н. Р.*).

Па закону 1856 г., які з невялікімі дапауненнямі існавау да канца XIX ст., былі уведзены тэрміны руху чыноунікау па службовай лесвіцы. Прычым ніхто не мог быць павышаны цераз чын ці мінаючы ніжэйшыя чыны. Закон устанавіу рэгулятар – бездакорнае і пахвальнае выкананне сваіх абавязкау, што было б пацверджана начальствам. Ужо з 1906 г. нават за выдатную службу нельга было прадстауляць да чыну асобу, што праслужыла менш за дваццаць гадоу у класных чынах [2]. Пры прызначэнні на дзяржауную службу прымаліся да увагі не толькі узрост (з 16 гадоу), адукацыя, але і паходжанне. Такое правіла існавала да 1906 г., калі усе саслоуі, нават падатныя, былі урауноўваны у правах на дзяржауную службу.

У другім артыкуле «Статута аб службе грамадзянскай» 1857 г. падкрэслівалася, што дзеці расійскіх падданых маюць права паступлення на грамадзянскую службу, калі яны ва узросце з 10 па 18 гадоу выхоуваліся пераважна у айчынных грамадскіх установах. У адваротным выпадку яны пазбауляліся права на займанне пасад у дзяржауных установах[3]. Анкета для паступаючага на службу утрымлівала наступныя пытанні: прыналеж-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm